## ГАНАРОВАЯ ЎЗНАГАРОДА

У ПАНЯДЗЕЛАК адбыўся ўрачысты мітынг, прысвечаны ўручэнню Белдзяржуніверсітэту імя У. І. Леніна Ганаровай граматы Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ГДР. Ганаровую грамату ўручыў Генеральны консул ГДР у Мінску С. Бернатэк. Ён цёпла павіншаваў з узнагародай і падзякаваў ардэнаносны калектыў універсітэта за важкі ўклад у справу падрыхтоўкі спецыялістаў для братняй краіны.

На мітынгу з вялікай прамовай выступіў рэктар універсітэта, акадэмік АН БССР У. А. Белы, які расказаў аб плённым навукова-тэхнічным супрацоўніцтве дзвюх краін, аб перспектывах яго далейшага развіцця, сардэчна падзякаваў за высокую адзнаку работы універсітэта.

Затым выступілі студэнт з ГДР Андрэас Фельдске-Брук, які навучаецца на пятым курсе гістфака, трэцякурсніца гістфака С. Дзяхцяр, доктар філалагічных навук, прафесар А. А. Лойка, намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта Л. Гайдукевіч.

Мітынг выліўся ў сапраўднае свята дружбы і братэрства паміж народамі ГДР і Савецкага Саюза.

**Наш кар.**

## Савецкія вучоныя! Павышайце эфектыўнасць даследаванняў!

## Няхай мацнее саюз навукі і вытворчасці!

## Слава савецкай навуцы!

*(З ЗАКЛІКАЎ ЦК КПСС ДА 64-й ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ).*


*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1981
29 КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 30 (1330)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА


"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### *ПРАЎЛЕННЕ ТАВАРЫСТВА*

**«Веды» Белдзяржуніверсітэта сумесна з гарадской арганізацыяй правялі чарговы набор слухачоў на 1981-82 навучальныя гады ў народны універсітэт «Метады прыкладной матэматыкі ў кіраванні вытворчасцю і навуковых даследаваннях» на наступныя факультэты: матэматычныя мадэлі і метады ў кіраванні, машынная матэматыка, планаванне і апрацоўка эксперымента, аўтаматызацыя праектавання электронных прылад.**

**Л. КЛЯУС,**
**адказны сакратар таварыства «Веды».**

### *СЕМІНАР НА ТЭМУ*

**«Ідэалагічная работа бібліятэк у святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС» правёў калектыў універсітэцкай бібліятэкі. У ходзе работы семінара былі абмеркаваны лекцыі: «Ідэалагічная работа на сучасным этапе», «Мастацтва і ідэалагічная барацьба» і іншыя. Вопытам работы па прапагандзе матэрыялаў XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ падзялілася загадчыца аддзела масавай работы бібліятэкі БДУ Р. І. Ляховіч.**

**А. СІНКЕВІЧ.**

### *ЭКСПЕРЫМЕНТАЛЬНАЯ*

**студыя студэнцкай творчасці (ЭССТ) ствараецца групай энтузіястаў пры камітэце камсамола гістарычнага факультэта з мэтай аб'яднаць творчыя сілы факультэта, прыцягнуць студэнтаў да больш актыўнага ўдзелу ў мастацкай самадзейнасці. Рыхтуецца да выпуску першы нумар бюлетэня ЭССТ.**

**Т. САХАШЧЫК.**

● **ПАДРЫХТОЎЦЫ КАДРАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ — УВАГУ І КЛОПАТ!**

## АГУЛЬНЫМІ НАМАГАННЯМІ

УНІВЕРСІТЭТ адзначае слаўны юбілей — сваё шасцідзесяцігоддзе. Ідучы насустрач знамянальнай даце, факультэты, кафедры, службы і падраздзяленні універсітэта ўзялі павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы. Адным з галоўных напрамкаў з'яўляецца падрыхтоўка навукова-педагагічных кадраў і абарона кандыдацкіх дысертацый аспірантамі і супрацоўнікамі універсітэта.

Упэўнена ідуць да намечаных рубяжоў механіка-матэматычны факультэт, фізічны. Стрымаў слова калектыў кафедры гісторыі філасофіі і логікі. Аднак не ўсе факультэты і кафедры паспяхова выконваюць узятыя абавязацельствы. Напрыклад, на геаграфічным факультэце было запланавана 4 абароны, а пакуль абаронена адна кандыдацкая дысертацыя. Такое становішча не можа не непакоіць.

Неабходна да канца года максімальна актывізаваць работу аспірантаў і супрацоўнікаў па падрыхтоўцы кандыдацкіх дысертацый, каб выканаць узятыя абавязацельствы.

**Л. ЯНОЎСКАЯ,**
**загадчыца аддзела аспірантуры.**

## САРДЭЧНА ВІНШУЕМ!

**КАНДЫДАЦКІЯ ДЫСЕРТАЦЫІ Ў ВЕРАСНІ, КАСТРЫЧНІКУ 1981 ГОДА АБАРАНІЛІ:**

**В. У. БРЭНЕР, механіка-матэматычны факультэт, кафедра функцыянальнага аналізу** (навуковы кіраўнік дацэнт А. Б. Антаневіч);

**АЛІУ ЛО СЕРЫНЬ, механіка-матэматычны факультэт, кафедра функцыянальнага аналізу** (навуковы кіраўнік дацэнт А. Б. Антаневіч);

**В. Н. ШАЛІМА, факультэт прыкладной матэматыкі, кафедра вылічальнай матэматыкі** (навуковы кіраўнік дацэнт У. В. Бабкоў);

**Б. П. УСЦІНАЎ, факультэт радыёфізікі, кафедра электронных матэматычных машын** (навуковы кіраўнік старшы навуковы супрацоўнік І. А. Малевіч);

**У. Г. ПАПОЎ, фізічны факультэт, кафедра фізічнай оптыкі** (навуковы кіраўнік прафесар Д. С. Умрэйка);

**А. Р. ЦЫГАНОЎ, хімічны факультэт, кафедра аналітычнай хіміі** (навуковы кіраўнік прафесар Г. Л. Старобінец);

**А. А. ГРЫНКЕВІЧ, хімічны факультэт, кафедра арганічнай хіміі** (навуковы кіраўнік прафесар І. Р. Цішчанка, дацэнт А. М. Бубель);

**У. В. МАГІЛЬНЫ, НДІ ПФП,** (навуковы кіраўнік дацэнт І. П. Зяцькоў);

**Л. Р. УВАРАВА, НДІ ПФП** (навуковы кіраўнік дацэнт І. П. Зяцькоў, прафесар С. С. Іванчаў);

**А. В. ПАЎЛАЎ, НДІ ПФП,** (навуковы кіраўнік дацэнт І. П. Зяцькоў);

**З. Я. АНДРЫЕЎСКАЯ, геаграфічны факультэт, кафедра геаграфіі мацерыкоў і акіянаў** (навуковы кіраўнік прафесар В. А. Жучкевіч, прафесар Т. М. Курыленка).



Лабараторны практыкум у трэцякурснікаў хімфака вядзе дацэнт кафедры аналітычнай хіміі У. А. Вінарскі.

# Творчыя вытокі

У СТУДЭНЦКІМ КЛУБЕ мастацкай самадзейнасці ажыўлена. Чуецца размова пра выступленні агітбрыгады, харавой капэлы. Вось дзяўчаты прыйшлі запісвацца ў ансамбль народных інструментаў, хтосьці пытаецца пра білеты на кінауніверсітэт. Маляўнічыя афішы танцавальнага ансамбля «Крыжачок», плакаты аб правядзенні конкурсаў палітычнай песні, сувеніры, прызы, атрыманыя універсітэцкай самадзейнасцю ў час гастрольных выступленняў... Усё пераканаўча падкрэслівае шматгранную дзейнасць клуба мастацкай самадзейнасці сярод творчай студэнцкай моладзі.

У БДУ працуе дзесяць калектываў мастацкай самадзейнасці. Чатыры з іх носяць ганаровае званне «народны». У гэтым годзе арганізаваны новыя калектывы: студэнцкі тэатр мініяцюр, агітбрыгада, вакальна-інструментальны ансамбль, пачалі сваю работу фальклорны ансамбль і студыя пантамімы. Фальклорна-этнаграфічны ансамбль арганізаваны на базе фальклорнай групы механіка-матэматычнага факультэта. Кіруе ім выпускніца інстытута культуры Валянціна Гладкая. У ансамблі — 25 чалавек. Калектыў працуе над новай праграмай, у складзе якой абрадавыя, жніўныя і вясельныя песні.

У мінулым годзе прайшоў першы фестываль палітычнай песні моладзі і студэнтаў Беларусі. Чатыры дні гучалі песні міру ў выкананні вакальна-інструментальных ансамбляў, вакальных груп і салістаў. Самадзейныя артысты выступалі на прадпрыемствах, правялі мітынг у Хатыні. Перамогу ў конкурсе атрымала трыо студэнтаў нашага універсітэта (Аляксандр Сідзяк, Алена Зайцава і Алена Бялова). Лаўрэатамі конкурсу сталі і студэнты філфака Алег Ацьман і Уладзімір Васіленка. Спецыяльны прыз атрымала студэнтка філалагічнага факультэта Алена Булыга за выкананне ўласных песень.

Квартэт гістфака (Наталля Кузьміч, Ірына Міхайлава, Іра Піўчанка, Алена Сівалобава) удзельнічаў у V Інтэрнацыянальным студэнцкім фестывалі палітычнай песні ў Маскве. Яны сталі яго дыпламантамі.

Цяжка пералічыць усе тыя гарады, дзе выступалі калектывы мастацкай самадзейнасці універсітэта. У Тальяці, Самаркандзе, Рызе, Ленінградзе, Маскве — самыя лепшыя водгукі аб нашых мастацкіх калектывах.

Усё больш папулярным сярод гледачоў становіцца студэнцкі народны тэатр. Яго спектаклі збіраюць шматлікую аўдыторыю. Вялікі поспех мела прэм'ера спектакля па п'есе А. Валодзіна «Дзве стралы». Калектыў тэатра працуе над новай п'есай А. Валодзіна «Яшчарка», а таксама рыхтуе да пастаноўкі спектакль па п'есе В. Кандрацьева «Водпуск па раненню».

Калектывы мастацкай самадзейнасці вядуць шырокую канцэртную і прапагандысцкую дзейнасць на прадпрыемствах Мінска, у падшэфным Уздзенскім раёне, у гарадах і сёлах рэспублікі. Усяго самадзейныя артысты далі каля 200 канцэртаў.

**А. ВАСІЛЬКЕВІЧ.**



**Ніколі не пустуе спартыўная зала універсітэта. Баскетбалісты змяняюць валейбалістаў, гімнасткі — рапірыстаў, аматары ручнога мяча — іншых спартсменаў. Кожная гадзіна заняткаў набліжае студэнтаў да вышынь спартыўнага майстэрства. Тут рыхтуюцца чэмпіёны.**

Фота **В. Шачака.**

# РАСКАЗ АБ ДЗЕЛАВЫМ ЧАЛАВЕКУ

— ЯК ГЭТА АДБЫЛОСЯ? — перапытаў мяне з усмешкай Міхаіл Даўгяла.— Ды я і сам спачатку здзівіўся. Тады якраз я вярнуўся з ГДР, дзе праходзіў вучэбна-вытворчую практыку. Прыходжу на наш гістарычны, бачу: неяк дзіўна прыглядаюцца да мяне таварышы, быццам ацэньваюць. А хутка даведаўся: прапанавалі маю кандыдатуру на пасаду старшыні прафбюро. Здзівіўся— ніколі дагэтуль не займаўся прафсаюзнай работай. Справа для мяне новая — і раптам узначальваць прафбюро. А ў прафкоме універсітэта на ўсе мае пытанні адказалі так: «Хлопец ты дзелавы, людзей ведаеш добра, а значыць, павінен справіцца». Шчыра, кажучы, адмаўляцца і не думаў. Не ў маім гэта характары.

Многія з тых, каму даводзіцца працаваць побач з Міхаілам Даўгяла, старшынёй прафбюро гістфака, гавораць, што ёсць у яго нейкая ўпэўненасць у сваіх магчымасцях, цвёрдасць характару і разам з тым душэўная дабрата.

З першых жа дзён, калі Мішу абралі, ён акунаецца ў студэнцкія справы. Ішло засяленне ў інтэрнат. Не ўсе атрымалі месцы. Дзе шукаць дапамогі? Вядома, звяртаюцца ў прафбюро. І Міша з асаблівай увагай адносіцца да кожнай кандыдатуры.

Пра інтэрнат можна размаўляць доўга. Лічыцца, што гэта другі наш дом. Сапраўды, так і павінна быць. Але, каб пакоі зрабіліся ўтульнымі, трэба па-гаспадарску адносіцца да інтэрната. Прафбюро і студсавет заўсёды дапамагаюць адзін аднаму.

...Будынак інтэрната № 1, дзе жывуць студэнты гістарычнага факультэта, стары, без асаблівых выгод. Хлопцы і дзяўчаты нібы ўдыхнулі ў яго жыццё, напоўнілі доўгія калідоры смехам, жартамі, сваёй маладосцю...

Аднойчы раніцой на заняткі іх пабудзіў не прывычны гадзіннік, а музыка. Рытмічная, бадзёрая. У інтэрнаце пачаў працаваць радыёвузел. Кожную пятніцу па ім перадаваліся паведамленні факультэцкага жыцця.

А потым, некалькі разоў у месяц, сталі з'яўляцца аб'явы аб сустрэчах з выкладчыкамі факультэта: праводзіліся лекцыі, вечары пытанняў і адказаў. Нельга было забываць і аб замежных сябрах, якіх у інтэрнаце 162 чалавекі. І вось спецыяльна для іх ствараецца пакой інтэрнацыянальнай дружбы, выпісваецца каляровы тэлевізар, набываюцца музычныя інструменты.

Не бывае такіх спраў, якія б не датычылі прафбюро. Напрыклад, конкурс мастацкай самадзейнасці. Члены прафбюро прагледзелі ўсе асабістыя карткі студэнтаў, карпатліва адбіралі тых, хто спявае, танцуе, чытае вершы. Патрэбны касцюмы? Шукаюць. На аглядзе мастацкай самадзейнасці БДУ гістфак заняў другое месца. Ёсць у гэтай перамозе і прафсаюзная «лепта».

Лічбамі дапамога прафбюро студэнтам вызначаецца так: 82 студэнты гістарычнага факультэта ў мінулым годзе адпачылі ў прафілакторыі, а 12 з іх атрымалі бясплатныя пуцёўкі. Пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва выязджалі на экскурсію ў Брэст. Была арганізавана турыстычная паездка па маршруту Талін — Рыга — Ленінград.

Зараз Міхаіл Даўгяла — студэнт пятага курса. Пасля прафсаюзнай справаздачна-выбарнай канферэнцыі ён перадаў справы. Канферэнцыя надала дзейнасці прафбюро яшчэ большую актыўнасць.

**Р. ЛАПУШЫН.**



Народная харавая капэла універсітэта.

Фота **В. Шачака.**

# ЛЕТАПІС БДУ

**ГОД ЮБІЛЕЙНЫ**
**(Заканчэнне. Пачатак у №№ 27, 29).**

**4 чэрвеня**

Газета «Беларускі універсітэт» апублікавала «Умовы сацыялістычнага спаборніцтва ў Беларускім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна ў XI пяцігодцы».

**17 чэрвеня**

За дасягнутыя поспехі ў выкананні заданняў дзесятай пяцігодкі па падрыхтоўцы спецыялістаў для народнай гаспадаркі Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі: Т. І. Прытыцкую — загадчыцу кафедры універсітэта, прафесара; ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга: У. Р. Івашына — прарэктара універсітэта, прафесара, В. Ф. Чыгіра — дэкана факультэта, прафесара; ордэнам Дружбы народаў: А. А. Лойку — прафесара; М. Т. Рамноўскага — дэкана факультэта, прафесара; ордэнам Знак Пашаны: У. Р. Барышэўскага— прафесара; медалём «За працоўную доблесць»: В. П. Ананька — загадчыцу аддзела бібліятэкі; П. І. Брыгадзіна — сакратара камітэта камсамола універсітэта; П. М. Гапоніка — старшага навуковага супрацоўніка НДІ ФХП; М. І. Казлоўскага — начальніка навукова-даследчага сектара; медалём «За працоўную адзнаку»: В. Г. Маркаву — галоўнага бухгалтара універсітэта, Н. К. Аўсянка — майстра вучэбна-вытворчых майстэрань; В. А. Прокашаву— асістэнта.

**28 чэрвеня**

Уручаны дыпломы аб заканчэнні універсітэта 43 юнакам і дзяўчатам з 9 краін свету, 4— з адзнакай. Усяго універсітэт за два дзесяцігоддзі закончыла звыш 4500 замежных студэнтаў.

**Чэрвень**

Калектывы БДУ і БПІ зацверджаны Мінвузам СССР выканаўцамі па праблеме «Змест, формы і метады камуністычнага выхавання ў вышэйшай школе» на адзінаццатую пяцігодку.

V злёт студэнцкіх будаўнічых атрадаў універсітэта ў Шчамысліцы.

Усесаюзная навукова-метадычная нарада-семінар «Актуальныя праблемы методыкі выкладання дысцыплін класічнай філалогіі і замежных літаратур», арганізаваны на базе філалагічнага факультэта Міністэрствамі вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і БССР.

**29 ліпеня**

На геастанцыі «Валожын» адкрыта база адпачынку для выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

**1 жніўня**

Арганізацыя навукова-даследчай часткі універсітэта на базе навукова-даследчага сектара праблемных і галіновых лабараторый.

**Верасень**

На міжнародным кірмашы ў Плоўдзіве дэманстраваліся прылады «АТНС-БДУ», лічбавы радыёізатопны шчыльнамер, спектрометр электроннага парамагнітнага рэзанансу і інш., сканструяваныя супрацоўнікамі фізічнага факультэта, факультэта радыёфізікі і электронікі і НДІ ПФП.



Першакурснікі хімфака на лекцыі па гісторыі КПСС.

Фота В. Шачака.

# «ДЗЯКУЙ ТАБЕ, БДУ!»—

## ГАВОРАЦЬ ЗАМЕЖНЫЯ СТУДЭНТЫ-ВЫПУСКНІКІ, РАЗВІТВАЮЧЫСЯ З БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТАМ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

**ХАСЭ АГУСЦІН МЕХАІС ДЭЛЬГАДА, КУБА, ВЫПУСКНІК ФАКУЛЬТЭТА РАДЫЁФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ:**

— Пяць гадоў вучобы — гэта мноства дзён, якія былі запоўнены заняткамі, цікавымі сустрэчамі. Усё, чаму навучыўся ва універсітэце, я аддам на карысць сваёй радзімы. Дзякуй тым, хто ўвесь гэты час дапамагаў мне — маім выкладчыкам, савецкім студэнтам — тым самым яны дапамагалі сацыялістычнай Кубе.

**КАЛОГА СЕКУ, ГВІНЕЯ, ВЫПУСКНІК ХІМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА:**

— Савецкія людзі — нястомныя барацьбіты за мір. Гэта мы адчулі, знаходзячыся на вучобе ў Беларусі. Разам з імі мы заўсёды будзем змагацца за свабоду і незалежнасць чалавецтва.

**МОРА ПАУЛА ГРЫСЭЛЬ МАРГАРЫТА, КУБА, ВЫПУСКНІК ФІЗІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА:**

— Дружалюбнасць і гатоўнасць заўсёды дапамагчы сустрэў я ў Савецкім Саюзе. Ніколі не забуду выкладчыкаў, супрацоўнікаў і рабят гэтай цудоўнай краіны, якія рабілі ўсё магчымае дзеля таго, каб мы адчувалі сябе як дома, не мелі цяжкасцей у вучобе.

# Конкурс па грамадскіх навуках

ЧАРГОВАЕ пасяджэнне аргкамітэта па правядзенню І тура ІХ Усесаюзнага конкурсу па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднаму маладзёжнаму руху адбылося ва універсітэце. На ім былі заслуханы даклады намесніка загадчыка кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў дацэнта Ф. І. Мельніка, загадчыка кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў дацэнта М. І. Базылева, намесніка загадчыка кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў дацэнта А. М. Елсукова, у якіх гаварылася аб ходзе работы па падрыхтоўцы і правядзенню І тура конкурсу.

Выступаючыя — старшыня універсітэцкага аргкамітэта дацэнт П. П. Дронь, намеснік старшыні Савета па НДРС універсітэта А. Ф. Нікіценка, старшыня НСС А. В. Рубанаў — адзначылі, што кафедры грамадскіх навук правялі значную работу: імі шырока прапагандзіруецца значэнне конкурсу для развіцця навуковага студэнцкага пошуку, для ўзмацнення пазнавальнай актыўнасці студэнтаў у вывучэнні грамадскіх навук, творчага авалодання марксісцка-ленінскай тэорыяй і павышэння грамадска-палітычнай актыўнасці.

Але не ўсе кафедры грамадскіх навук універсітэта надаюць сур'ёзнае значэнне своечасоваму правядзенню мерапрыемстваў, якія звязаны з падрыхтоўкай да конкурсу. Да іх адносяцца кафедры гісторыі філасофіі і логікі, палітэканоміі гуманітарных факультэтаў, этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму.

Аргкамітэтам таксама былі разгледжаны пытанні, звязаныя з правядзеннем універсітэцкай канферэнцыі па выніках І тура Усесаюзнага конкурсу па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху і намечаны шэраг мерапрыемстваў, якія садзейнічаюць паспяховаму завяршэнню конкурсу.

**А. НІКІЦЕНКА,**
**намеснік старшыні Савета па навукова-даследчай рабоце студэнтаў універсітэта.**

● З НАШАЙ ПОШТЫ

# СУВЯЗЯМ МАЦНЕЦЬ

ТРЫ ГАДЫ назад я і мае землякі прыехалі на вучобу ў Савецкі Саюз з Малагасійскай рэспублікі. І мне хочацца расказаць савецкім студэнтам аб сваёй Радзіме, аб брацкіх сувязях з Савецкім Саюзам.

Мая краіна размясцілася на поўдні афрыканскага кантынента, на востраве Мадагаскар. Яна займае плошчу 596 тысяч квадратных кіламетраў. Пражывае ў ёй 9 мільёнаў чалавек, сталіца — Антананарыву — вельмі прыгожы і вялікі горад з насельніцтвам звыш 400 тысяч чалавек. Мая радзіма з далёкіх часоў была акупіраваная французскімі каланізатарамі. Але ў 1960 годзе ў выніку рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, пасля ўпартай барацьбы нашага народа была звергнута ўлада французскіх каланізатараў, якія рабавалі краіну, вывозілі карысныя выкапні, усяляк эксплуатавалі малагасійцаў каля 200 гадоў. Народная ўлада тады не была ўстаноўлена, кіраванне краінай захапіла буржуазная вярхушка. Просты народ, як і раней, цярпеў нягоды, беднасць. Змянілася толькі тое, што яго прыгнятала ўжо свая, нацыянальная буржуазія.

У 1975 годзе малагасійцы, даведзеныя да адчаю, узняліся на рэвалюцыйную барацьбу і звергլі ўладу класа, які панаваў. Была абвешчана дэмакратычная рэспубліка. На кіруючыя пасты выбраны прадстаўнікі рэвалюцыйна-дэмакратычнай партыі.

На Мадагаскары пачала развівацца свая нацыянальная прамысловасць, умацавалася сельская гаспадарка. Першым руку дапамогі нашай краіне працягнуў Савецкі Саюз. Былі наладжаны дыпламатычныя, эканамічныя, культурныя сувязі. Інжынеры, урачы, аграномы і іншыя вопытныя савецкія спецыялісты працуюць сёння на Мадагаскары, а шматлікія прадстаўнікі моладзі нашай краіны навучаюцца ў Савецкім Саюзе. Пройдзе зусім нямнога часу і мы зможам перадаць набытыя веды роднаму народу.

**ЖАРЖЫН РАВАУ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

**Цікава праходзіць лабараторны практыкум у студэнтаў хімфака. Тэарэтычныя веды, якія атрыманы на лекцыях, замацоўваюцца на практыцы, доследах, што праводзяцца ў лабараторыі кафедры хіміі высокамалекулярных злучэнняў.**

**НА ЗДЫМКУ: вядуць доследы трэцякурсніцы 3 групы хімфака Н. Пальчэўская і І. Ціхамірава пад кіраўніцтвам дацэнта В. М. Сідэрка.**

Фота **В. Шачака.**



# ДАКРАНАННЕ ДА ПАМЯЦІ

ЗА ВОКНАМІ турысцкага аўтобуса—жоўтавалосая беларуская восень. Бярозкі туляцца да вечназялёных хваін, нібы просячы ў тых жыццёвай сілы, каб вярнуцца ў квяцістую маладосць. Прыгожа!

Але нейкія асаблівая пранікнёныя ноткі ў голасе экскурсавода прымушаюць экскурсантаў адарваць позірк ад пейзажных малюнкаў. У салоне ўсталёўваецца цішыня.

— Мы з вамі наведаем мемарыяльны комплекс «Хатынь», дзе, як і ў шматлікіх гарадах і вёсках Беларусі, у час Вялікай Айчыннай вайны ад рук нямецка-фашысцкіх карнікаў загінулі тысячы ні ў чым не павінных мірных жыхароў.

Гэтыя словы нікога не пакінулі абыякавымі. Сэрцам зразумелі іх тыя, хто толькі год назад яшчэ не ведаў ніводнага рускага слова, хто зусім нядаўна пасля спякотнай Афрыкі ці Азіі апынуўся на хлебасольнай беларускай зямлі. На мемарыял едуць замежныя студэнты І курса факультэта журналістыкі. Дзеці народаў, якія скінулі кайданы каланіялізму і зараз на руінах імперыялістычнага гаспадарання закладваюць фундамент новага грамадства, народаў-барацьбітоў за поўную незалежнасць, нёабыякава ставяцца да геаічнага мінулага нашай Радзімы. Цёплы кастрычніцкі дзень шчодра рассыпае восеньскую пазалоту. Сонца песціць халоднымі ўжо промнямі верхавіны дрэў. Лісце, развітваючыся з жыццём, павольна закрывае траву барвовым дыванам. Вось гэтак жа ткала восень яркую посцілку і роўна 38 гадоў назад...

Чароўнасць залатога дня парушаюць нягромкія манатонныя гукі. Яны паўтараюцца зноў і зноў. Званы Хатыні! Вы кранаеце сэрца кожнага, хто ступае на гэту шматпакутную зямлю, прымушаеце схіліць галаву перад помнікамі.

Каля бронзавай скульптуры непакаронага з мёртвым хлопчыкам на руках стаіць чалавек, які да нядаўняга часу не ведаў, што ёсць на свеце Хатынь. Пра што ён думае? Пра жудасную лічбу бязвінных ахвяр? Пра тое, што ў апошнюю вайну загінуў кожны чацвёрты жыхар Беларусі? Успамінае сваю краіну, сваіх герояў, якія цаной уласнага жыцця прынеслі народу незалежнасць?

Лічбы, лічбы... Вялікія, страшныя. За імі — спаленыя вёскі, гарады. Людзі, дзеці, якія не дажылі, не ўбачылі гэты сонечны кастрычніцкі дзень. Мора кветак на мемарыяле...

Праз 5 гадоў, атрымаўшы ў Савецкім Саюзе адукацыю, вернуцца да сябе на радзіму сённяшнія нашы замежныя аднакурснікі. Дзе б ні былі яны, што б ні рабілі, памяць аб тым, што бачылі тут, у Хатыні, стане для кожнага назаўсёды абавязкам захаваць на планеце мір, не дапусціць паўтарэння жахаў Бухенвальда і Асвенцыма, Трасцянца і Хатыні.

**А. ГРЫШКЕВІЧ,**
**студэнтка І курса журфака.**

# І БЫЛІ БУДНІ ГАРАЧЫЯ

У ВЕРАСНІ яны таксама хацелі ехаць. Разам з іншымі курсамі. На камсамольскім сходзе рашылі:

— Будзем прасіць дэканат, камітэт камсамола... Чаму «бульба» — «прывілея» малодшых курсаў?

Неяк няёмка адчувалі сябе камсамольцы ў паўпустым корпусе геафака. І само па сабе не раз узнікала пытанне:

— Няўжо наша дапамога не патрэбна цяпер сельскай гаспадарцы?

Іх ініцыятыву адобрылі.

— Усе працавалі сумленна, — гаворыць асістэнт кафедры агульнага землязнаўства і кіраўнік студэнцкага дэсанта Лілія Уладзіміраўна Мар'іна. — Цяжка нават назваць лепшых. Але правафланговыя ў нас, вядома ж, былі. Гэта — Аляксандр Гарбачоў, Сяргей Касцюк, Галіна Губаева, Рыма Махава, Ігар Кострыкаў...

Перад самым ад'ездам, на сваім апошнім агульным сходзе, сельгасатрад рашыў пералічыць усе заробленыя грошы ў Фонд міру.

**В. ЛАПІН.**

г. п. Узда.

### ДАПАЎНЕННЕ

У мінулым нумары быў апублікаваны састаў мясцовага камітэта прафсаюза. Выпадкова былі прапушчаны прозвішчы двух членаў мясцкома. Гэта: **Сумарокава Валянціна Сцяпанаўна** — член арганізацыйна-масавай камісіі, выкладчык кафедры грамадзянскай абароны і **Урбан Васіль Уладзіміравіч** — член жыллёва-бытавой камісіі, малодшы навуковы супрацоўнік НДІ ПФП.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

29 кастрычніка 1981 г.

АТ 02484 Зак. 1718.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ